Беларуская пошта – разам з лічбавымі тэхналогіямі!

На сённяшні дзень у Рэспубліцы Беларусь сетка паштовай сувязі налічвае больш за **3 900** аб'ектаў паштовай сувязі, пры гэтым **71 працэнт** аб'ектаў размешчана ў сельскай мясцовасці.

Ліцэнзію на аказанне паслуг паштовай сувязі агульнага карыстання па перасылцы паштовых адпраўленняў, прыёму падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі і іх дастаўцы маюць **27 аператараў паштовай сувяз**і, з іх 21 – на паслугі па перасылцы паштовых адпраўленняў, 6 – на прыём падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі і іх дастаўкі.

Да навін і дасягненняў у сферы паслуг паштовай сувязі, рэалізаваным за апошні час на базе IT-тэхналогій, адносяцца развіццё нацыянальнай паштовай электроннай сістэмы, электроннай авансавай сістэмы, сэрвісаў «Мабільны паштальён», прылад самаабслугоўвання QR box, а таксама пашырэнне сеткі паштаматаў.

Нацыянальная паштовая электронная сістэма – гэта зручны і хуткі спосаб перасылкі простых і заказных лістоў у электроннай і гібрыднай форме з пацверджаннем факту ўручэння. Колькасць зарэгістраваных карыстальнікаў у сістэме складае больш за **6,3** тыс. карыстальнікаў.

Электронная авансавая сістэма – гэта аблічбаваны аналаг папяровай авансавай кніжкі, які дазваляе юрыдычным асобам ажыццяўляць online залічэнне і спісанне грашовых сродкаў за паслугі паштовай сувязі, а таксама аплачваць шырокі спектр паслуг паштовай сувязі. Колькасць заключаных дагавораў на аказанне паслуг з выкарыстаннем сістэмы складае больш за **25,0** тыс. штук.

Сэрвіс **«Мабільны паштальён»** забяспечвае населеныя пункты шырокім спектрам паслуг па-за аб'ектам паштовай сувязі, у тым ліку паслугамі паштовай сувязі, банкаўскімі, фінансавымі і іншымі паслугамі. За студзень-верасень 2025 г. з дапамогай службы аказана больш за **17,0** млн. паслуг.

Для павышэння ўзроўню абслугоўвання карыстальнікаў і скарачэння іх часу чакання пры атрыманні паштовых адпраўленняў працягваецца пашырэнне сеткі і функцыянальных магчымасцяў **паштаматаў**. Сетка паштаматаў краіны цяпер складае больш за **220 адзінак**.

У мэтах развіцця лічбавых сэрвісаў з ліпеня 2024 года ўкаранёны сэрвіс па афармленні і аплаце ў асабістым кабінеце паштовага адпраўлення для адпраўкі **ў месцах самаабслугоўвання QR box**. Адпраўка ажыццяўляецца шляхам сканавання QR-кода ў мабільным дадатку. За студзень-верасень 2025 г. з дапамогай QR box адпраўлена больш за **25,0** тыс. паштовых адпраўленняў.

Малюнак



Source URL: *https://mpt.gov.by/belaruskaya-poshta-razam-z-lichbavymi-tekhnalogiyami*